Андрончык К.Я, студ. гр. 450 ФІДК
БГУ культуры і мастацтваў
Навуковы кіраўнік – Бяспалая М.А.,
доктар гістарычных навук, прафесар

# НАВУКОВАЕ ДАСЛЕДАВАННЕ Ў ГАЛІНЕ МУЗЕЙНАЙ КАМУНІКАЦЫІ (НА ПРЫКЛАДЗЕ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ГІСТАРЫЧНАГА МУЗЕЯ БЕЛАРУСІ)

Навукова-даследчая праца - адзін з вядучых накірункаў дзейнасці кожнага музея. Гэта прадугледжвае выяўленне і збор прадметаў музейнага значэння, іх захаванне, стварэнне выстаў і экспазіцый, а таксама правядзенне культурна-асветніцкай працы.

Навукова - даследчая дзейнасць Дзяржаўнага гістарычнага музея мае сваю гісторыю. Першым крокам яе з'яўляецца стварэнне метадычнага адзела ў 1967 годзе, якім праводзілася асноўная навуковая праца, асноўных відам якой з'яўлялася напісанне метадычных пісем і рэкамендацый, якімі карысталіся ўсе музеі БССР. Вялікая ўвага надавалася культурна - асветніцкай працы музея. Вялася метадычная распрацоўка экскурсій. У сувязі з агульнасаюзным аглядам музеяў, прысвечанаму 50-годдзю ўтварэння СССР былі напісаны пісьмы "Формы массовой научно-просветительской работы музеев к 50-летию образования СССР". У 1970-1972 гадах былі падрыхтаваны метадычныя рэкамендацыі "О методической разработке экскурсий", "Методика проведения экскурсий".

У савецкі час выдвалася значная колькасць каталогаў,брашур, паштовак, пуцевадзіцеляў. Адным з самых цікавых каталогаў, на наш погляд, з'яўляўся каталог "Плакаты первых лет советского строительства", які быў выдадзены ў1985 годзе. Нягледзячы на тое, што навуковая дзейнасць, як і ўся дзейнасць музеяў гісторыка-рэвалюцынага профілю, музея насіла спецыфічны савецкі "характар", Дзяржаўны музей БССР з'яўляўся буйным навукова-метадычным цэнтрам у галіне музейнай справы Беларусі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З канца 1980-х гг. музеі гістарычнага профілю ў большай ступені, чым іншыя, апынуліся ў складаным пошуку самавызначэння. Шматлікія гістарычныя экспазіцыі, створаныя яшчэ ў савецкі час, састарэлі. Дзяржаўны музей БССР не выключэнне. У канцы 1980-х гадоў гістарычная экспазіцыя Дзяржаўнага музея БССР стала аб’ектам грамадскай крытыкі [5, с. 386 ]

У дадзены перыяд былі папулярымі натупныя выставы: “Францыск Скарына і яго час” , “Унікальная калекцыя вырабаў з янтару”, Мінскі клад[1,арк. 2], “Чарнобыль – знак бяды,” “Праца і святкаванне ў польскім народным мастацтве” [2, арк. 3].”Загадкавая фантазія мора”, “Чэшская біжутэрыя” [3, арк. 2]. У гэты перыяд ў дзейнасці музея назіраецца пошук матэрыялаў , якія б грунтоўна паказвалі наведвальнікам праўду па ўсіх раздзелах гісторыі Беларусі, робяцца першыя крокі ствараць выставы на матэрыялах звязаных з рэпрэсіямі[5, с. 387 ] .

У гэты час выдаецца шмат цікавых каталогаў,напрыклад, “Афішы беларускіх вечарын і спектакляў(1910-1917гг.)”, “Археалагічныя калекцыі.Жалезны век”. У 2003 годзе ўбачылі свет каталог” Леў Дашкевіч” і “Партрэт Вялікага Княства Літоўскага ХУІ-ХУІІІ стст.” Трэба адзначыць, што каталогі сучаснага перыяду адрозніваюцца па зместу ад савецкіх і маюць высокую якасць мастацкага афармлення. Адной з асаблівасцей навукова-даследчай дзейнасці музея ў гэты перыяд з'яўляецца выданне календароў.Так ў 2003 годзе былі выдадзены календары: “Белпромстройбанк: история банка, 1923-2003”,”Скарбы зямлі беларускай”.

Пашырыліся і міжнародныя сувязі музея, усталёўваюцца добрыя двухбаковыя адносіны з музеямі Літвы, Латвіі, Польшчы, Расіі, Швецыі. Эстоніі, Кітая. 17 кастрычніка 2003 года праходзіў Міжнародны навукова-практычны семінар “Нацыянальныя гістарычныя музеі ад Балтыйскага да Чорнага мораў”.[7,с.3]

Значнай падзеяй 2003 года з'явілася міжнародная выстава “Стваральнікі дзяржавы. Гістарычны партрэт ХУІ-ХХ стст.”, якая прайшла ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нацыянальным мастацкім музеі Літвы. У праекце бралі ўдзел буйнейшыя музеі Літвы, Польшчы, Украіны, Беларусі. Праект "Лета беларускай культуры на Сардзініі" праходзіў у італьянскім горадзе Кальяры ў жніўні 2003 г. [7, с. 4]

Зараз музей выдае часопіс "Музейны веснік", які заснаваны ў 2003 годзе і друкуецца па рашэнню навукова - метадычнага савета музея. За 2003 – 2008 гг. выйшла 4 нумары. Але для належнага адлюстравання ўсіх відаў даследванняў выдання "Музейнага весніка" стала недастаткова. Так нарадзілася ідэя стварэння "Археалагічнага зборніка",які быў выпушчаны ў 2006 годзе.

У 2005 г. музей атрымаў грант Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА ў Рэспубліцы Беларусь, што дало магчымасць адкрыць у памяшканні музея па вуліцы Фрунзе, 19 першую ў краіне лабараторыю прэвентыўнай кансервацыі [6, с. 3]. У кастрычніку-лістападзе мінулага года на базе лабараторыі прайшла Першая міжнародная школа музейных кансерватараў, у ходзе якой спецыялісты пятнаццаці музеяў Беларусі атрымалі тэарэтычныя і практычныя навыкі па кансервацыі музейнага тэкстылю і керамікі. Статус міжнароднай школе забяспечыў удзел у яе рабоце загадчыцы лабарторыі керамікі Археалагічнага музея ў Варшаве Агнешкі Барт [6,с. 3].

Паглыбленае вывучэнне фондавых калекцый заўсёды адносіцца да прыярытэтаў музейнай дзейнасці. Актывізацыі гэтай работы, безумоўна, паспрыяла поўная зверка фондаў, якая завяршылася ў 2007 годзе. Яна дала добрую магчымасць яшчэ раз прааналізаваць сучасны стан, паўнату, якасць навуковай апрацоўкі музейных калекцый, акрэсліць далейшыя шляхі іх камплектавання[4, с. 4].

Асабліва важнай і актуальнай задачай з'яўляецца стварэнне новай экспазіцыі музея, якая б на сучасным навуковым і мастацкім узроўні адлюстроўвала гісторыю Беларусі. Яна ахоплівае айчынную гісторыю ад каменнага веку да атрымання і станаўлення дзяржаўнай незалежнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Створана толькі навуковая канцэпцыя гэтай экспазіцыі. А пакуль што знаёмства наведвальнікаў са здабыткамі нашай мінуўшчыны адбываецца шляхам выставак з уласных фондаў. У 2008 годзе былі паспяхова рэалізаваны тры значныя выставачныя праекты: "Гісторыя Беларусі XVI—XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы", "Касцярэзнае рамяство Беларусі ад першабытнасці да Сярэднявечча", "З крыніц адвечнай прыгажосці" (золата і срэбра са збору музея)[4, с. 3]. У час работы над азначанымі праектамі было выкарыстана шмат цікавых навуковых і мастацкіх падыходаў, якія могуць быць запатрабаваны ў далейшым пры стварэнні асноўнай экспазіцыі.

Такім чынам, у дадзены перыяд, уся дзейнасць Нацыянальнага гістарычнага музея абапіраецца на навуковыя даследаванні, якія з'яўляюцца неабходнай умовай функцыянавання музея.

Спіс літаратуры:

1. Архіў Нацыянальнага гістарычнага музея РБ. Справаздача аб навукова асветніцкай рабоце ў 1990 годзе. Арк. 1 - 6.

2. Архіў Нацыянальнага гістарычнага музея РБ. Справаздача аб навукова асветніцкай рабоце ў 199 годзе. Арк. 1 - 6.

3. Архіў Нацыянальнага гістарычнага музея РБ. Справаздача аб навукова асветніцкай рабоце ў 1992 годзе. Арк. 1 - 6.

4. Вечар,С.У. Уступнае слова./ С.У. Вечар// Музейны веснік. - 2008. - №4. – С.3 – 4.

5. Памяць: гіст. – дакум. хроніка Мінска. У 5 кн. / рэд. кал.: Г. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш. ]. – Мінск: БелЭн, 2007. Кн. 5. Ч.2. : Музеі Мінска / А. Гужалоўскі. – С. 382 -387.

6. Хацько,П.С. Зберажэнне гісторыка – культурнай спадчыны прыярытэтны кірунак дзейнасці Нацыянальнага музея гісторыі і культуры./ П.С.Хацько// Музейны веснік. - 2006. - №3. – С.3 – 4.

7. Хацько,П.С.Уступнае слова./ П.С.Хацько// Музейны веснік. - 2005. - №2. – С.3 – 4.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ